**ГАРАЧЫ ЧЭРВЕНЬ 41-га ...**

**З успамінаў І. М. Родзіка, г.п. Вялікая Бераставіца**



***І. М. Родзік.***

Івану Міхайлавічу Родзіку ўжо больш 80-ці гадоў. Усе жыццё ён пражыў у Вялікай Бераставіцы. І ўсе падзеі, што адбываліся, і ўся гісторыя, здаецца, нібы ў яго на далоні. І пачатак той страшнай вайны перад вачыма... Іван Міхайлавіч успамінае:

—...Той спякотны чэрвень 1941-га запомніўся назаўсёды. Акупацыя для нас пачалася на каталіцкае свята Пятра і Паўла, якое выпадае на 29 чэрвеня. У той год гэта была нядзеля. Многія жыхары з раніцы апраналіся па-святочнаму, збіраліся ў храм.

Свята, аднак, аказалася зусім не святочным... Ворагі паявіліся ў Вялікай Бераставіцы на матацыклах. Першыя месяцы акупанты паводзілі сябе больш-менш стрымана. Толькі на вуліцах і падворках рэзала слых чужая гаворка: «Матка – сала! Матка – яйкі!» А потым пачаліся рэпрэсіі. Усіх мясцовых яўрэяў сагналі у гета, якое немцы арганізавалі ў будынках вакол сінагогі, у квадраце паміж вуліцамі (цяперашняя назва): Кастрычніцкая, Леніна, Савецкая, Рабочая. Мучылі голадам і здзекамі, а праз некаторы час вывезлі ў Крынкі і , напэўна, знішчылі.

Перад вайной яўрэйскае насельніцтва складала значную частку жыхароў мястэчка. Большасць яўрэяў займалася гандлем і рамяством. Адных толькі крамаў яўрэйскіх было звыш дзесятка. Цяпер хіба толькі старажылы памятаюць магазіны Рабіновіча, Гдаля, Шалепскага, Гухналя, Зэйды, Аўсіевіча... У «жалезнай» краме Шварцбуха можна было набыць сельскагаспадарчы інвентар. Мабыць, на ўсю Бераставіччыну славіўся сваімі прысмакамі прадуктовы магазін Волбжыка (размяшчаўся на месцы цяпершняй музычнай школы). У яўрэяў можна было браць тавар, часам, «на вексель», з пазнейшым разлікам.

Спакон вякоў у Вялікай Бераставіцы не было міжнацыянальнай розні. Мірна ладзілі паміж сабой беларусы, палякі, яўрэі, рускія - усе былі бераставічанамі. А тут адразу крамы яўрэйскія зачынілі, з гаспадарамі расправіліся. У першыя месяцы ваеннага ліхалецця ў Вялікай Бераставіцы працавала ўжо толькі адна крама - паляка пана Мудрэвіча. Да яго немцы адносіліся талерантна, а людзі мясцовага гандляра паважалі - гаваркі быў чалавек, усе навіны ведаў, дапамагаў людзям, чым мог. Але чалавека хутка не стала…

Запісаў Іван Руткоўскі, г.п. Вялікая Бераставіца, 2008 год.